# ЗМЯСТОЎНЫЯ ДАМІНАНТЫ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АСПЕКТ

М.М. Шчэрбін
УА МДПУ ім. І.П. Шамякіна

Мадэрнізацыя грамадзянска-патрыятычнага выхавання праз удасканаленне яго зместу як адна з перспектыўных задач павышэння выхаваўчых функцый адукацыі з’яўляецца важным накірункам навуковага пошуку сучаснай педагагічнай тэорыі і практыкі.

Ужо старажытныя крыніцы – летапісы, хронікі, жыціі – змяшчаюць каштоўныя ідэі аб тым, якім павінен быць патрыёт і грамадзянін сваёй краіны. Вызначэнне якасных характарыстык зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ажыццяўлялася або напрамую праз усхваленне запатрабаваных рыс і якасцей асобы, або ускосна – праз ганьбаванне заганаў і недахопаў.

Старажытныя асветнікі, адстойваючы ідэі адзінства, міру, добразычлівасці ў адносінах паміж людзьмі, вызначалі іх у якасці падмурку выхавання чалавека, адданага сваёй Радзіме (Е. Полацкая, К. Тураўскі). Асуджэнне міжусобіц і неабходнасць клопату аб сваёй Айчыне з’яўляліся лейтматывам першых летапісных крыніц “Аповесці



МГПУ им. И.П. Шамякина

мінулых гадоў” і “Слова пра паход Ігаравы”, што вылучалі такія адносіны важнай састаўляючай зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання маладога пакалення [15].

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне ў якасці аднаго з вядучых у сістэме станаўлення асобы разглядалі беларускія асветнікі-гуманісты, звяртаючы ўвагу на неабходнасць рэфармавання яго зместу.

М. Гусоўскі важнымі састаўляючымі зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання адзначаў беражлівасць, вернасць, павагу ў адносінах сваёй Бацькаўшчыны і яе каштоўнасцей, сцвярджаў неабходнасць асабістай адказнасці чалавека за лёс сваёй Радзімы [14]. Чырвонай ніткай праз усю спадчыну Ф. Скарыны праходзіць ідэя служэння на карысць свайго народа і краіны, увасобленая ў хрысціянскай самаадданасці, чалавекалюбстве, імкненні да справядлівасці як змястоўнага канцэпту грамадзянска-патрыятычнага выхавання [9]. С. Будны быў перакананы ў надзвычайнай ролі ў выхаванні прыхільнасці сваёй Радзіме, “богабаязнасці, справядлівасці і міласэрнасці” ў якасці падмурку выхавання патрыёта і грамадзяніна [14, с. 220]. В. Цяпінскі выступаў за падтрымку роднай мовы, гісторыі і культуры, адзначыў іх выключнае значэнне ў выхаванні “зычлівасці” да сваёй Айчыны [14, с. 233].

Летапісныя крыніцы XV–XVI стст. (“Летапісец Вялікіх князёў літоўскіх”, “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”, “Хроніка Быхаўца”) на дзяржаўным узроўні сцвярджалі неабходнасць падтрымання цэласнасці і суверэнітэту краіны, вызначаючы гэтыя грамадзянска-патрыятычныя рысы ў якасці важнага кампанента зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання [14, 28, 31].

Прагрэсіўныя погляды аб неабходнасці грамадзянска-прававога выхавання “добранадзейных сыноў Айчыны” былі выказаны Л. Сапегам, А. Воланам, М. Літвіным. Мысліцелі XVI ст. побач з любоўю і вернасцю чалавека да Радзімы вызначалі грамадзянскую адказнасць перад іншымі людзьмі, грамадствам, дзяржавай як аснову паводзін патрыёта і грамадзяніна. Згодна з перакананнямі асветнікаў добрае грамадства тое, дзе “…права ў роўнай ступені служыла ўсім”, а добрага грамадзяніна, адпаведна, лепшым чынам характарызуе “…абарона законаў і звычаяў свайго народа” [14, с. 278].

Запатрабаванасць грамадзянска-патрыятычнага выхавання як важнага сродку адстойвання самастойнасці беларускіх зямель у XVII – пач. XVIII ст. абумовіла ўвагу да пераасэнсавання яго зместу сярод прадстаўнікоў палемічнай літаратуры – А. Філіповіча, М. Сматрыцкага, Л. Карповіча, З. Капысценскага. Побач з хрысціянскімі дабрачыннасцямі, на думку мысліцеляў, для патрыёта і грамадзяніна сваёй Радзімы, павінна быць уласціва імкненне да дасягнення “грамадскага шчасця”, згоды і дабрабыту, нягледзечы на светапоглядныя або рэлігійныя перакананні [2], [14], [20].


МГПУ им. И.П. Шамякина

Вядомыя беларускія этнографы XIX–XX стст. Я.Ф. Карскі, А. К. Сержпутоўскі, П.М. Шпілеўскі з далучэннем да сваёй мовы, культуры, гісторыі звязвалі развіццё цікавасці да мінулага, гонару за свій народ, умацаванне нацыянальнай свядомасці беларусаў у якасці ключавых падстаў зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання [19, 28]. Этнаграфічныя работы, накіраваныя на папулярызацыю беларускага фальклору, з'яўляюцца значнымі крыніцамі грамадзянска-патрыятычнага выхавання на традыцыйных каштоўнасцях беларускай культуры як важнага складальніка яго зместу.

Грамадзянска-патрыятычную праблематыку закраналі ў сваёй творчасці беларускія пісьменнікі В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, якія любоў да роднага краю, яе прыроды, людзей лічылі падмуркам развіцця чалавека-патрыёта і чалавека-грамадзяніна.

Педагогі і грамадскія дзеячы А. Я. Багдановіч, Ф.А. Кудрынскі, К. І. Ціхаміраў адзначалі каштоўнасць для гарманічнага развіцця выхаванцаў фарміраванне такіх грамадзянска-патрыятычных якасцей як любоў і прыхільнасць да каштоўнасцей сваёй Радзімы [1, 2].

Прыярытэт грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў савецкай навуцы і практыцы ў кантэксце працоўнага, ваенна-патрыятычнага, інтэрнацыянальнага і іншых відаў выхавання з'яўляўся адной з асаблівасцей развіцця савецкай школы, што прадвызначыла ўвагу да рэфармавання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання (Н. К. Крупская, С. А. Казлова, Р. І. Жукоўская, Н. Ф. Вінаградава).

Актывізацыя даследаванняў па грамадзянска-патрыятычнай тэматыцы ў другой палове XX ст. абумовіла з'яўленне навуковых прац, прысвечаных розным аспектам тэорыі і практыкі выхавання моладзі. Шэраг гісторыка-педагагічных даследаванняў закранаюць праблемы фарміравання цэласнай асобы выхаванца ў кантэксце сістэматызацыі педагагічнай спадчыны беларускіх зямель (Э. К. Дарашэвіч, М. С. Мяцельскі, С. А. Умрэйка [1]), вырашэння актуальных праблем выхавання (А. А. Грымаць, Ф. В. Кадол, Р. С. Піонава [10, 17]), метадалагічнага і метадычнага бакоў адукацыі (А. П. Сманцэр, В. П. Таранцей, В. У. Чэчат) [27].

Да пытанняў гістарычнага асэнсавання філасофіі культуры і адукацыі звярталіся А. С. Майхровіч, С. А. Падокшын, У. М. Конан [19] і інш., нацыянальна-культурныя аспекты станаўлення асобы ў сувязі з этнагістарычнымі працэсамі, рэлігійнымі асаблівасцямі развіцця беларускіх зямель разглядалі Л. В. Вансовіч, Н. А. Кутузава, С. У. Марозава, А. П. Мельнікаў, В. У Старасценка [6], [20], [22], [24], [28].

Вывучэнню педагагічнага патэнцыялу творчай спадчыны беларускіх асветнікаў, гуманістаў, рэфарматараў прысвечаны работы У. А. Арлова, Г. Я. Галенчанка, В. А. Чамярыцкага, В. Ф. Шалькевіча, якія закранаілі

МГПУ им. И.П.Шамякина

разнастайныя магчымасці актуалізацыі выхаваўчых традыцый мінулага ў фарміраванні патрыётаў і грамадзян [9, 31, 33].

Гістарыяграфія даследаванняў праблемы змястоўнага напаўнення грамадзянска-патрыятычнага выхавання на сучасным этапе ўключае навуковыя работы разнастайнай скіраванасці:

З сацыяльна-філасофскага аспекту зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ўласцівы:

- сацыякультурныя і аксіялагічныя падставы развіцця (Е. В. Беляева, Т. А. Гутарчык, А. М. Пракофьева, М. Ю. Узгорак) [11], [29];
- гістарыка-культурная дэтэрмінацыя (І. А. Барсук, А. Л. Барчук) [3];
- нацыянальна-культурная абумоўленасць (А. І. Ляўко, В. В. Мартынава, А. С. Майхровіч, С. А. Подокшын) [19], [21], [23].

З псіхолага-педагагічнага аспекту змест грамадзянска-патрыятычнага выхавання разглядаецца на падставе:

- псіхолага-педагагічных умоў фарміравання (Ф.В. Кадол, Л. А. Казінец, Е. Ю. Крыкала, Н. М. Снапко,) [2], [17], [18];
- аналізу эфэктыўнасці і спосабаў павышэння выніковасці (К. В. Гаўрылавец, С. Н. Захарава, У. Т. Кабуш, І. Ф. Харламаў) [8], [12], [16], [30];
- спосабаў, форм, метадаў працэсуальнай арганізацыі (В.У. Буткевіч, І. А. Калеснікава, А. У. Талкачова, В. П. Петухоў) [5], [27];
- этнакультурнай асновы і рэгіянальных асаблівасцей (Г. П. Арлова, В. С. Болбас, Е. Ф. Івашкевіч, С. В. Снапкоўская, Ю. В. Чарняўская) [2], [4], [13], [25], [32].

З этнагістарычнага аспекту змястоўнае напаўненне грамадзянска-патрыятычнага выхавання дэтэрмінавана:

- гісторыка-культурнымі ўмовамі існавання народу (І. У. Вішнеўская. Л. М. Лыч, А. П. Мельнікаў, В. У. Старасценка) [7], [24], [28].
- тэндэнцыямі і асаблівасцямі развіцця сістэмы адукацыі (С. М. Вансовіч, В. Н. Лухверчык, С. В. Снапкоўская) [2], [6];
- спецыфічнай этнаканфесійнай сітуацыі (В. В. Грыгор'ева, Н. А. Кутузава, В. І. Навіцкі, Е. Н. Філатава) [20], [27];

Такім чынам, эвалюцыя вызначэння змястоўных дамінант грамадзянска-патрыятычнага выхавання дазволіць тэарытычна абгрунтаваць магчымасці сучаснага выкарыстання айчыннага гісторыка-педагагічнага вопыту па выхаванні патрыётаў і грамадзян сваёй Айчыны, будзе садзейнічаць гістарычнасці і нацыянальна-культурнай пераемнасці ў арганізацыі выхаваўчага працэсу.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост. Э. К. Дорошевич, М.С. Мятельский, П.С. Солнцев. – М.: Педагогика, 1986. – 468 с.

2. Асвета і педагагічная думка Беларусі: Са старажытнасці да пачатку XX ст. / Пад рэд. С.В. Снапкоўскай (адк. рэд.), Г.Р. Сянькевіч [і інш]. – Мінск: Нац. інстытут адукацыі, 1995. – 205 с.



МГПУ им. И.П.Шамякина

3. Болбас, В.С. Этычная педагогіка беларусаў / В.С. Болбас. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 175 с.

4. Борчук, А.Л. Историко-теоретический анализ проблемы формирования патриотизма и гражданственности / А.Л. Борчук // Пазашкольнае выхаванне. – 2003. – № 3. – С. 28 – 29.

5. Буткевич, В.В. Становление основ гражданского воспитания в истории педагогической мысли Беларуси / В.В. Буткевич, О.В. Толкачева // Межд. конкурс педагогов: сб. материалов 5-го подсеминара / под общ. ред. проф. М.М. Сидоренко. – Артек, 2001. – С. 5–10.

6. Вансович, Л.В. Белорусоведение: учебное пособие / Л.В. Вансович. – Минск: ТетраСистемс, 2005. – 224 с.

7. Вішнеўская, Л.В. Грамадзянская актыўнасць як састаўляючая грамадзянскага выхавання. / Л.В. Вішнеўская. – Мінск., 2006. – 80 с.

8. Гавриловец, К.В. Научение человека жить счастливо как стратегическая цель воспитания/ К. В. Гавриловец // Праблемы выхавання. – 2011. – № 3. – С. 5–7.

9. Галенчанка, Г.Я. Эпоха Скарыны. Тэарытычныя і гістарычныя праблемы Рэнесанса на Беларусі / Г.Я. Галенчанка // Наш Радавод: матэрыялы міжнар. навук. канф. "Гістарычная памяць народаў ВКЛ і Беларусі XIII – XX стст. / пад рэд. Д. У. Карава. – Гродна, 1996. – Кн. 7. С. 184–186.

10. Грымаць, А.А. Нацыянальная самасвядомасць і праблемы сацыялізацыі моладзі / А. А. Грымаць // Нацыянальная самасвядомасць і выхаванне моладзі: зб. навук. Прац / Нац. ін-т адукацыі; навук. рэд.: А. С. Лапцёнак, В. А. Салееў (адк. рэд.) [і інш]. – Мінск: НІА, 1996. – 119 с.

11. Гутарчык, Т.А. Патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне / Т.А. Гутарчык // Народная асвета. – 2002. – № 8. – С. 71–72.

12. Захарова, С.Н. Гражданином быть обязан: Основы гражданского образования: метод. пособие / С.Н. Захарова. – Минск: Ред. науч.-метод. журн. «Пачатковая школа», 2003. – 96 с.

13. Ивашкевич, Е.Ф. Формирование гражданского достоинства учащихся 8 – 11 классов при изучении истории и культуры белорусского народа: авт. дис. … канд. пед. наук: 13. 00. 01. / Е.Ф. Ивашкевич; Витебск. гос. ун-т. – Витебск, 1998. – 20 с.

14. История общественной и философской мысли в Беларуси: раннее и развитое Возрождение: хрестоматия: пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2010. – 332 с.:ил.

15. История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха Средневековья: хрестоматия: пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2009. – 396 с.:ил.

16. Кабуш, У.Т. Патрыятызм – інтэграваная якасць асобы школьніка / У.Т. Кабуш // Народная асвета. – 2003. – № 12. – С. 46–47.

17. Кадол, Ф.В. Воспитание чести и достоинства старшеклассников / Ф.В. Кадол. – Минск, 1998. – 208 с.

18. Козинец, Л.А. Теория и практика гражданского воспитания учащихся / Л.А. Козинец, Е.Ю. Крикало. – Мозырь: Содействие, 2006. – 144 с.

19. Конан, В.М. Становление и развитие философской мысли в X – XVII вв. / В.М. Конан, А.С. Майхрович, С.А. Подокшин // Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. / П.Т. Петриков [и др]. – Минск: Навука і тэхніка, 1996. – С. 98 – 116.

20. Кутузова, Н.А. Нация, религия и государственность в полемической литературе Беларуси конца XVI – первой половины XVII в. / Н.А. Кутузова. – Минск, 1998. – 93 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

21. Левко, А.И. Модель воспитания гражданственности и патриотизма в современных условиях / А И. Левко, Л.А. Худенко // Столичное образование. – 2002. – № 10. – С. 4–9.
22. Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі / С.В. Марозава; пад навук. рэд. У.М. Конана. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 352 с.
23. Мартынова, В.В. Гражданин: Прогр.-метод. реком. по орг. работы с уч-ся / В.В. Мартынова. – Минск: Народная асвета, 1995. – 45 с.
24. Мельников, А.П. Национальный менталитет белорусов / А.П. Мельников. – 2-е изд. – Минск: Право и экономика, 2005. – 112 с.
25. Народная педагогіка: вучэбна-метадычны дапаможнік / Г. П. Арлова [і інш.]; УА "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. П. М. Машэрава". – Віцебск: ВДУ ім. П.М. Машэрава, 2006. – 168 с.
26. Петухоў, У. М. Цывілізацыйны падыход да грамадзянскага выхавання / У. М. Петухоў // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 2. – С. 88–95.
27. Сманцер, А.П. Гуманизация педагогического процесса в современной школе: история и современность: учебно-методическое пособие / А.П. Сманцер. – Минск: БГУ, 2010. – 112 с.
28. Становление национального самосознаия белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII вв.). / В.В. Старостенко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2001. – 200 с.
29. Узгорок, М.Ю. Аксиологические основания патриотизма (на материале белорусской духовной культуры): автореф. дис. … канд. филос. наук: 24.00.01 / М.Ю. Узгорок. – Гродно, 2011. – 20 с.
30. Харламов, И.Ф. Основные вопросы организации воспитательной работы в школе / И.Ф. Харамов. – Минск, 1967. – 175 с.
31. Чамярыцкі, В.А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў / В.А. Чамярыцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 192 с.
32. Чернявская, Ю. В. Народная культура и национальные традиции: Пособ. для учителей / Ю.В. Чернявская. – Минск: Беларусь, 2000. – 199 с.
33. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мінск: Маладзежнае навуковае супольніцтва, 2002. – 248 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина